**Сутула, Г.** Кіеў – Глыбокае: знаёмай дарогай – да мамы / Г. Сутула // Веснік Глыбоччыны. – 2018. – 25 жн. – С. 3.

## КІЕЎ—ГЛЫБОКАЕ: ЗНАЁМАЙ ДАРОГАЙ – ДА МАМЫ

*Амаль паўстагоддзя Уладзімір Леанідавіч Пашковіч жыве за межамі Беларусі. Куйбышаў, Баку, Валгаград, Астрахань, Кастрама, Ленінград, Кіеў, Кабул, Джалалабад, Баракі-Барак, Пулі-Хумры, Чарнобыль, Спітак... На геаграфічнай карце яго лёсу шмат гарадоў, з якімі звязана біяграфія, радасныя і трагічныя старонкі жыцця. Але дзе б ён не быў, галоўнай была і застаецца дарога да мамы, у роднае Глыбокае. Вось і сёлета, пяцьдзясят шосты раз з часоў развала Савецкага Саюза, сын у чарговы раз прыехаў на пабыўку да мамы.*



### Дзяцінства на Інтэрнацыянальнай

У сям'і Леаніда Васільевіча і Клаўдзіі Уладзіміраўны Пашковічаў было двое дзяцей: сын Валодзя і дачка Тоня. Валодзя вучыўся ў СШ №1 горада, дырэктарам якой тады быў Яўген Пятровіч Арэтаў. Хлопцу добра даваліся фізіка і хімія, таму, атрымаўшы атэстат, ён разам з чатырма равеснікамі, у ліку якіх быў і Сяргей Цэмахаў, паехаў паступаць на лячэбны факультэт Віцебскага медыцынскага інстытута. Валодзя, які ў шаснаццаць з паловай гадоў упершыню прыехаў з перыферыі ў вялікі горад, аказаўся ў ліку шчаслівчыкаў. Радасная тэлеграма з адным словам:«Паступіў» паляцела ў Глыбокае да мамы.

### Вучоба і каханне – па сумяшчальніцтве

З жонкай Яўгеніяй Канстанцінаўнай Уладзімір пазнаёміўся ў медінстытуце, дзе яна вучылася на кардыёлага. Дзяўчына нарадзілася ў сям'і святара, айца Канстанціна ільчэўскага і матушкі Веры, у якой падрасталі пяцёра дзяцей. Пачуццё ўзнікла паміж маладымі людзьмі з першага погляду. Сумяшчаць вучобу і каханне было не лёгка, але маладосць не зважала на складанасці: на экзаменах па медыцыне атрымлівалі «паспяхова», а экзамен на трываласць пачуццяў здавалі ўсё жыццё. Ажаніліся студэнтамі яшчэ не маючы на руках дыпломаў. Перш чым стаць дыпламаваным спецыялістам Яўгенія стала мамай двух сыночкаў – Сяргея і Яўгена. І пакуль муж калясіў па прасторах Савецкага Саюза, яна гадавала дзяцей і надзейна ахоўвала сямейны тыл.

– Я даслужыўся да палкоўніка, а мая Жэня – для мяне была любімым генералам, бо на ёй усё трымалася, – сказаў Уладзімір.

## Лейтэнант медыцынскай службы

Адвучыўшыся чатыры гады ў Віцебску, Уладзімір перавёўся ў Куйбышаў на ваенна-медыцынскі факультэт – гэтае рашэнне на многія гады звязала яго з арміяй. Ваенны загад часта адпраўляў яго ў дарогу, якая магла стаць апошняй...

У 1972 годзе скончыў медінстытут, атрымаў званне лейтэнанта медыцынскай службы і накіраванне ў Бакінскую ваенную акругу. Там, нягледзячы на адсутнасць вопыту, маладога ўрача адправілі ў Валгаград. Але ён – жанаты чалавек, жонка павінна скончыць інстытут, якога не было ў Валгаградзе. Па гэтай прычыне лейтэнанта Пашковіча накіравалі ў Астрахань і прызначылі начальнікам медыцынскай службы радыятэхнічнай брыгады.

Старанны, адказны, працалюбівы беларус выдатна зарэкамендаваў сябе і яго, як кажуць, прыкмеціла начальства. Запрасілі ў Баку на месца начальніка таксікарадыялагічнай лабараторыі акружнога санэпідатрада. Гэта была пасада падпалкоўніка – кар'ерны рост быў забяспечаны, перспектыва праглядалася выдатная.

Уладзімір Леанідавіч некалькі разоў павышаў кваліфікацыю ў Ленінградскай ваенна-медыцынскай акадэміі імя Кірава, а ў 1979 годзе зноў стаў студэнтам: паступіў туды на факультэт кіруючага састава медыцынскай спужбы Узброеных Сіл Савецкага Саюза на аддзяленне радыялогіі, таксікалогіі і эпідэміялогіі. Скончыў акадэмію з «чырвоным дыпломам» і павінен быў атрымаць вялікую пасаду ў Маскве, але гэтаму перашкодзіла сваяцтва... з цесцем-бацюшкам.

Замест Масквы яго накіравалі ў Кіеў начальнікам гігіенічнага аддзела Кіеўскай ваеннай акругі. Там афіцэру Пашковічу далі кватэру. Здавалася б, жыві і радуйся, але..

## У Афганістан – па ўласным жаданні

1982 год. Уладзімір напісаў рапарт з просьбай адправіць яго ў Афганістан, дзе на той час ужо ішла вайна. Жонцы сказаў, што атрымаў загад і тая, паплакаўшы, пагадзілася з такім выклікам лёсу. Ужо будучы ў Кабуле, Уладзімір атрымаў пісьмо ад цесця-бацюшкі, які быў уражаны яго ўчынкам, пахваліў за вернае служэнне Айчыне, дзеля якога ён ахвяраваў сям'ёй і дзецьмі, і падтрымаў выбар зяця.

У Афганістане Уладзімір быў галоўным радыёлагам-таксіколагам 40-й арміі і па сумяшчальніцтве пазаштатным сакратаром супрацьэпідэміялагічнай камісіі Узброеных Сіл.

– У Афганістане ваявалі, былі дыверсіі, таму мы трымалі на кантролі сістэмы водазабеспячэння, правяралі пітную ваду на наяўнасць таксінаў, кантралявалі ўзровень выхлапных газаў на перавале Саланг, дзе быў 3-кіламетровы тунель паміж высокімі гарамі, выбіты ў каменнай тоўшчы Пндукушы. Там аднойчы атруціліся каля дзвюх соцень ваеннслужачых, – расказвае Уладзімір Леанідавіч. – Акрамя таго, салдаты гінулі ад куль  душманаў яны сотнямі паміралі ў шпіталях ад інфекцыйных захворванняў – малярыі, халеры, брушнога тыфу. Працаваў у лабараторыі, бываў у камандзіроўках, хадзіў з дэсантнікамі ў разведпаходы, неадночы лятаў у Пулі-Хумры (правінцыя Баглан), дзе на той час знаходзіўся арсенал 40-й арміі – гаспадарчыя склады забеспячэння ўсім неабходным: ад прадуктаў харчавання да амуніцыі і медыкаментаў. Прыходзілася са зброяй перамяшчацца на бронетранспарцёрах, «вяртушках». Быў выпадак, што ляцеў разам з «грузам 200» на «Чорным цюльпане» – тады якраз адзін салдат вёз на радзіму цела брата-блізняца, які загінуў у баі… Маленькаму чалавеку на вялікай вайне было не проста... Асабіста я пра смерць не думаў, можа, таму і страху не адчуваў. Я быў салдатам на вайне, які добрасумленна выконваў прафесійны абавязак у баявых умовах. Ну а як урач, тое што бачыў у Афганістане, параўноўваў з пеклам: кроў, смерць, інфекцыі, пакуты, спякота...Калі выдавалася вольная хвілінка, уключаў радыёпрыёмнік і слухаў беларускія песні. І так хацелася тады дамоў, у родныя глыбоцкія мясціны.

## З вайны – пад радыяцыю

– З Афганістана я прыехаў падпалкоўнікам. Пакуль быў там – у Глыбокім памёр бацька. Я не паспеў на яго пахаванне і да цяперашняга адчуваю сваю віну, – кажа Уладзімір Леанідавіч. – У 1984 годзе вярнуўся ў Кіеў, стаў выкладчыкам на кафедры таксікалогіі і медыцынскай аховы ў Кіеўскім медінстытуце.

Прайшлі ўсяго два гады – і зноў новае выпрабаванне. У красавіку 1986 года палыхнуў Чарнобыль. Уладзіміра прызначылі галоўным радыёлагам III асобай зоны, і ў кастрычніку-лістападзе ён знаходзіўся ў небяспечнай камандзіроўцы ў Чарнобылі.

– Атрымаў заданне арганізаваць работу па дэзактывацыі даху трэцяга энергаблока па суседстве з узарваным чацвёртым. У аператыўнай групе было 16 чалавек. Мая задача – вымяраць дозы радыяцыі, разлічваць дапушчальныя для чалавека нормы і час яго знаходжання на аб'екце. А на даху 3 тысячы 600 рэнтген у гадзіну. Значыць, я мог дапусціць чалавека да работы ўсяго на 23 хвіліны.

Што можна было зрабіць за такі час? – дзівіцца Уладзімір Леанідавіч. – Але трэба было тэрмінова адсылаць справаздачу ў Маскву, дзе ўжо рыхталіся «звесці праблему Чарнобыля на нуль». Працаваў я больш за месяц, апраменіўся як мае быць і вярнуўся на кафедру героем, ад якога падалей стараліся трымацца калегі і студэнты, – у расказе ноткі горычы перамяжоўваюцца з жартоўнымі.

– Адзін быў плюс ад камандзіроўкі: я атрымаў заробак, камандзіровачныя, прэміяльныя і купіў за іх новыя «Жыгулі-дзевятку».

Ну а калі сур’ёзна, то Чарнобыль праявіўся праз нейкі час: пачаў садзіцца голас, і я не змог працаваць выкладчыкам.

## Землятрасенне ў Арменіі

8 снежня 1988 года адбылося Спітакскае землятрасенне магутнасцю 7-8 балаў, а ў эпіцэнтры – у горадзе Спітаку – 9—10 балаў. Была поўнасцю зруйнавана паўночная частка Арменіі на тэрыторыі з мільённым насельніцтвам. У выніку яго 25 тысяч чалавек загінулі, 19 тысяч засталіся інвалідамі, 514 тысяч – без даху над галавой. З-за рызыкі аварыі была спынена работа Армянскай атамнай станцыі.

Уладзімір Леанідавіч аказаўся ў эпіцэнтры трагедыі, тры месяцы працаваў галоўным эпідэміёлагам. На ўласныя вочы бачыў стадыён у Спітаку, які ператварыўся ў трупярню – загінуўшых не паспявалі вывозіць на могільнікі. На ліквідацыі працавалі ваеннаслужачыя Узброеных Сіл ССР, пагранічных войск КДБ, брыгада ў складзе ста медыкаў, у асноўным палявых хірургаў. Узнаўляць разбураную Арменію прыехалі добраахвотнікі са 111 замежных краін. З Арменіі Уладзімір прыехаў з пачуццём выкананага абавязку, з болем у сэрцы і ў званні палкоўніка.

– У Афганістане я зламаў пазванок, але, не вяртаючыся адтуль, стаў на ногі. Мог загінуць пад кулямі, памерці, падхапіўшы інфекцыю. Сваю чорную справу магла зрабіць радыяцыя, але ўдача мяне не абыходзіла бокам. Напэўна, малітва мамы і цесця-святара ў многім захіналі ад бяды, – разважае мой суразмоўца.

І ўсё ж у яго жыцці без трагедыі нё абышлося. Боль ад перажытага не сціхае і сёння, і на вачах палкоўніка блішчаць слязінкі.

## Жыццё, як чорны-белыя клавішы раяля

У 1977 годзе трагічна загінула малодшая сястра Уладзіміра Тоня. Яе сына Андрэя гадавала бабуля Клаўдзія Уладзіміраўна з сынам. У 1991-м бяда пастукала ў дзверы Уладзіміра.

– На той час у нас было трое дзяцей: Юля нарадзілася ў 1985-м, як я вярнуўся з Афганістана. Мы з жонкай былі ў камандзіроўках: я – у Харкаве, яна – у Румыніі. Малодшыя Яўген і Юля засталіся пад налядам старэйшага сына Сяргея, які на той час вучыўся ў медінстытуце. Прыехалі ў Кіеў цесць з цешчай з Кастрамы, а дзеці адны. Сяргея мы знайшлі толькі на восьмыя суткі. Дваццацігадовага ўнука адпяваў яго

дзядуля – айцец Канстанцін. Забойцаў сына не знайшлі да цяперашняга. Пасля гэтай трагедыі Уладзімір напісаў рапарт і звольніўся з арміі. Чорныя ўспаміны, як дрэннае надвор'е, змяняецца светлай рэальнасцю, і твар майго суразмоўцы маладзее.

У яго ж падрастаюць тры ўнучкі-прыгажуні. Старэйшая 20-гадовая Ліза, Ева, якая сёлета пойдзе ў першы клас, і маленькая Мая. Гэта самае каштоўнае багацце дзеда Уладзіміра, яго радасць, яго будучыня…

Што датычыць работы, то Уладзімір Леанідавіч нейкі час выкладаў у медінстытуце, затым працаваў начальнікам Цэнтра прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі і СНІДу інстытута праблем ваеннай медыцыны Узброеных Сіл Украіны. Займаўся цікавай для яго навуковай працай. Ён – кандыдат медыцынскіх навук, аўтар многіх даспедчых работ. З 2014 года, маючы 50 гадоў выспугі, пайшоў на заслужаны адпачынак. У наступным годзе адзначыць уласны юбілей, а сёлета 17 жніўня Уладзімір і яго сям'я, якая прыехала з Кіева, адзначалі ў Глыбокім 90-годдзе з дня нараджэння мамы Клаўдзіі Уладзіміраўны.

– Яна ў мяне не проста мама, а залатая і сярэбраная медалістка ВДНГ, выдатнік сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, самы дарагі на свеце чалавек. Я мог бы кожнае лета адпачываць у санаторыі, пенсію маю добрую, але кожны год на месяц прыязджаю ў Глыбокае. Дапамагаю маме, сустракаюся з былымі аднакласнікамі... Я вучыўся з Эдзікам Аленіным, Косцем Клемята, Янінай Жыла, кахаў Ізольду Асіненка (Свечнікаву)... Многія скончылі ВНУ, жывуць у Беларусі і за яе межамі. Падтрымліваем сувязі, два гады назад сустрэліся на імправізаваным веча-ры выпускнікоў. Успаміналі настаўнікаў, якія нас вучылі – першую настаўніцу Аляксандру Рубіс, якая была жонкай першага сакратара раёна, Васіля Кудашова, Цылю Евельсон, нашага класнага кіраўніка Таісу Рыжкову. На днях сустрэўся з Сашам Еркіным – мы з ім разам на дактароў вучыліся. Вечная памяць Уладзіміру Марцынкевічу, які быў хірургам ад Бога. Мы з ім у медакадэміі вучыліся, прайшлі Афганістан....

**«Каб любіць Беларусь нашу мілую...»**

– Я многа дзе быў, шмат чаго бачыў і перажыў, але Глыбокае для мяне было і застаецца самым дарагім горадам. Ён – калыска майго дзяцінства, месца душэўнага прытулку, ціхая гавань; тут з любых дарог мяне чакае мама, – кажа Уладзімір Леанідавіч. – У Беларусі, як і ў іншых краінах, свае праблемы і складанасці, але галоўнае тое, што тут спакойна і мірна, што старасць людзей пад надзейнай апекай дзяржавы.

*Галіна* ***СУТУЛА****,*

*фота з архіва У. Пашковіча*